# ПРАВІЛЫ КАРЫСТАННЯ ЗАЛАМІ ДЛЯ КАВОРКІНГУ

1. Залы для каворкінгу не выкарыстоўваюцца для правядзення мерапрыемстваў камерцыйнага характару. Любая форма атрымання прыбытку з’яўляецца парушэннем правілаў карыстання.
2. Кожны ўдзельнік групавога мерапрыемства павінен быць чытачом ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, а таксама выконваць тэхніку пажарнай і электрабяспекі.
3. Не дапускаюцца грубыя паводзіны і непаважлівае стаўленне да супрацоўнікаў ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” падчас правядзення групавых мерапрыемстваў у залах для каворкінгу.
4. Замова на тэматычны падбор літаратуры або выставу-прагляд прымаюцца не пазней, чым за 3 дні да правядзення групавога мерапрыемства.
5. Удзельнікі групавога мерапрыемства абавязаны выкарыстоўваць толькі тыя рэсурсы, змест якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь, а таксама не распаўсюджваць інфармацыю, якая зневажае гонар і годнасць грамадзян.
6. Забараняецца прыносіць у залы ежу і напоі (за выключэннем пітной вады).
7. Удзельнікам групавога мерапрыемства забараняецца прыносіць з сабою асабістае абсталяванне (за выключэннем партатыўнай камп’ютэрнай тэхнікі), ужываць бібліятэчную тэхніку без дазволу, перамяшчаць або пераўсталёўваць праграмныя сродкі.
8. Калі пасля правядзення групавога мерапрыемства зала засталася ў неадпаведным стане (група пакінула смецце, перастаўляла мэблю і г.д.), ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” затрымлівае за сабой права адмовіць арганізатару мерапрыемтсва ў далейшым супрацоўніцтве.
9. Парушэнне Правіл карыстання цягне за сабой пазбаўленне права працаваць у залах для каворкінгу.
10. Арганізтар групавых мерапрыемстваў нясе адказнасць за выконванне Правіл карыстання заламі для каворкінгу.